**Інтэлектуальная гульня “Размаўляем па-беларуску”**

**Мэта:** развіццё пазнавальнага інтарэса школьнікаў; выхаванне нацыянальнай самасвядомасці, патрыятызму і любові да Радзімы; садзейнічанне фарміраванню беларускамоўнага слоўнікавага запасу навучэнцаў.

**Ход гульні**

- Адгадаўшы крыжаванку.

1. На замок закрыты,
Кніжкамі набіты.
За плечы моцна ўзяўся,
На спіне ўладкаваўся. (Ранец)
2. Ляжыць паленца, а ў сярэдзіне сэрца. (Аловак)
3. Дзень прыбывае, а ён худае. (Каляндар)
4. Стаяць каля сцежкі Юлькі,
На іх белыя кашулькі.
Сэрцайкі ў іх залатыя,
Адгадайце, хто такія. (Рамонкі)
5. Не куст, а з лісточкамі,
Не кашуля, а пашыта.
Хто яе чытае,
Той розум мае. (Кніга)
6. Ён па лесе скок ды скок
Косіць вокам з боку ў бок.
У дупле вавёрка – шчоўк,
А яму здаецца – воўк. (Заяц)
7. Ля ракі жыве званар,
Ён балотны гаспадар.
Даўганогі, даўганосы,
Голас тонкі, а сам строгі. (Камар)
8. Пад хвоямі.
Пад смолкамі
Ляжыць
Клубок з іголкамі. (Вожык)
9. Мае звонкі галасок, усіх склікае на ўрок. (Званок)
10. Жыве ў норах хітры пёсік,
Поўсць рудая, чорны носік.
Памяло цягае ўслед,
Замятаючы ім след. (Ліса)
Вынік: РОДНАЯ МОВА.

- 21 лютага у нашай краіне адзначаецца Дзень роднай мовы. А якая мова з’яўляецца для нас роднай? А чаму менавіта беларуская мова з’яўляецца для нас роднай? Мы з вамі жывём у Беларусі. Беларусь – наша Радзіма. Тут мы вучымся, тут будзем працаваць. Тут жывуць нашы мамы і таты, дзядулі і бабулі. Кожны чалавек

павінен ведаць сваю мову, не саромецца размаўляць на роднай мове, умець спяваць народныя песні, танчыць народныя танцы.

Нямала добрых слоў выказалі дзеячы беларускай культуры пра крылатую мову свайго вольнага народа.

***Вучань:*** З легендаў і казак былых пакаленняў.
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор'яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц,
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, -
Ты выткана дзіўная родная мова.
Максім Танк

***Вучань:*** Родная мова, цудоўная мова!
Ты нашых думак уток і аснова!
Матчын дарунак ад самай калыскі,
Ты самацветаў яскравая нізка…
Кожнай драбнічкай ты варта пашаны,
Коднае слова вякамі створана,
І на вякі яно жыць застанецца,
Вечнае так, як народнае сэрца.
Уладзімір Дубоўка

**Інтэлектуальная гульня “Размаўляем па-беларуску”**

**1 конкурс “Шыфраванка”.**

З дапамогай шыфраванкі вы даведаецеся назву сваёй каманды.
3Б, 2В, 1А, 4Г, 4А, 1Г, 2Б 2Б, 4Г, 4А, 1Г, 3В, 1А, 2Г

**2 конкурс «Хвіліна эрудытаў»**

(за кожны правільны адказ — 1 бал).
1. Якім псеўданімам падпісваў свае творы Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч? (Якуб Колас)
2. Каго называюць беларускім першадрукаром? (Францішка Скарыну)
3. Што называюць «беларускім морам»? (Возера Нарач)
4. Які месяц у народзе называюць «гаручым, але не даручым»? (Ліпень)
5. Каго называюць нябеснай заступніцай зямлі беларускай?(Еўфрасінню Полацкую)
6. Назавіце славутую беларускую князёўну, дачку Рагвалода, якая мела тры імені (якія?). (Рагнеда — Гарыслава — Анастасія)

**3 конкурс «Кемлівыя і знаходлівыя»**

(максімальная колькасць балаў за кожны правільны адказ камандзе, удзельнікі якой першымі справяцца з заданнем — 2 балы)
Вучні атрымліваюць карткі з літарамі, з якіх неабходна будзе скласці правільны адказ на загадку.
Адгадайце загадку:
Што нас корміць, а есці не просіць? (зямля)

Што бяжыць без повада? (вада)
Па небу коціцца катушка, ні звер, ні птушка, ні пясок, ні вада, а адгадаць бяда. (сонца)
Каляровае карамысла цераз рэчку павісла. (вясёлка)

**4 конкурс «Хто хутчэй?»**

(За кожны правільны адказ — 1 бал)
Закончыце прыказку:
Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай … . (крыніцы)
Для ўсякай птушкі сваё гняздо … . (міла)
Родная зямелька як зморанаму … . (пасцелька)
У сваім краі, як у … . (раі)
Далёкая старонка без ветру … . (сушыць)
На чужыне і камар … . (загіне)
Кожнаму свой куток … . (мілы)
Усюды добра, а дома … . (лепей)
Кожная сасна свайму бору песню … . (пяе)
Жыць — Радзіме … . (служыць)

**5 конкурс «Перакладчыкі»**

Художник (мастак)
Вкусная еда (смачная ежа)
Сережки (завушніцы)
Сладкая земляника (салодкія суніцы)
Бусы( пацеркі, каралі)
Злая собака (злы сабака).

**6 Конкурс «чужое» слова сярод «сваякоў»**

(За кожны правільны адказ — 1 бал)
Патрэбна падкрэсліць лішняе слова ў кожным радку.
Рачулка, рачны, рак, рака.
Казка, расказваць, каза, казаць.
Весела, вяселле, вясёлы, вясло.
Вітамін, вітанне, развітаўся, прывітанне.
Вада, вадаправод, водар, водны.
Шкло, шкельца, школьнік, шкляны.

**7 Конкурс «Наборшчыкі»**

3 прапанаваных літар скласці як мага больш слоў, запісаць на ліст паперы. Н ападрыхтоўку адводзіцца 2 хвіліны. Каманда, у якой запісана большая колькасць слоў, атрымлівае 3 балы, астатнія — 2 балы. Дадатковы бал прысуджаецца той камандзе, якая складзе самае доўгае слова.
Б, К, У, В, Р, А, Ы, К, Н, А

**8 Конкурс «Наадварот»**

Падабраць словы з супрацьлеглым значэннем.
За кожны правільны адказ — 1 бал.
*Ранак-..., зіма-..., высока-....*
*Дзень-..., мір-..., шырокі-....*
*Мяккі-..., часта-..., белы-....*

*Чысты-..., ідзе-..., цяжка-....*

**9 Конкурс «Загадкі-пытанні»**

За правільны адказ — 1 бал.

Чаго на свеце багацей няма? *(Зямлі.)*

Што ляціць без крылаў? *(Вецер.)*

Што хутчэй за ўсё на свеце? *(Думка.)*

Што гаворыць на ўсіх мовах? *(Язык.)*

Што без слёз плача? *(Скрыпка.)*

Што без вады плавае? *(Воблака.)*

Пад які куст заяц садзіцца, калі дождж ідзе?*(Пад мокры.)*

Ці можа страус назваць сябе птушкай?*(Не, бо гаварыць не ўмее.)*

Дзе гарады без людзей, а рэкі без вады?*(На глобусе, карце.)*

Дзе мароз улетку водзіцца?*(У халадзільніку.)*

Чаго не абнясеш вакол хаты?*(Вады ў рэшаце.)*

На чым знаку не наложыш?*(На агні* і *вадзе.)*

***Падвядзенне вынікаў.***

Закончыць наша мерапрыемства мне хацелася б словамі Юрася Свіркі:

…Хацеў бы я,
Каб ты не забывала,
Што мову я не для сябе бярог.
Хацеў бы я,
Каб ты размаўляла,
Каб папраўляць цябе ніхто не змог.
Дачка мая, хачу, каб шлях кароткі
Да шчасця быў,
Каб ты яго знайшла,
Каб мову ты
Сваіх бацькоў і продкаў,
Як вернасць, як сумленне,
Берагла.

***Рэфлексія***